

**1 ліпеня – 75 гадоў з дня нараджэння Мікалая Уладзіміравіча РУМАКА (1941-1995, Пінскі р-н), вучонага ў галіне мікраэлектронікі, члена-карэспандэнта НАН Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1984)**

Мікалай Уладзіміравіч Румак нарадзіўся 1 ліпеня 1941 года ў вёсцы Хойна Пінскага раёна Пінскай (цяпер Брэсцкай) вобласці. У 1965 годзе скончыў Беларускі палітэхнічны інстытут. З 1967 года аспірант, малодшы навуковы супрацоўнік Фізіка-тэхнічнага інстытута АН Беларусі. З 1978 г. – загадчык аддзела, а з 1990 года – намеснік дырэктара па навуковай працы гэтага інстытута. Адначасова з 1988 года прафесар Беларускага дзяржаўнага універсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі. З 1994 па 1995 гг. старшыня Камітэта па навуцы і тэхналогіях Міністэрства адукацыі і навукі Беларусі.

У 1986 годзе М. У. Румак абараніў доктарскую дысертацыю, а ў 1988 годзе атрымаў званне прафесара. Навуковыя даследаванні ў вобласці мікраэлектронікі. Унес уклад у рашэнне праблем сінтэзу шматслойных кампазіцый метал-дыэлектрык-паўправаднік са строга рэгламентаванымі параметрамі.

Выканаў комплекс работ па развіццю тэорыі акіслення паўправаднікоў, даследаванню прыроды ўзаемадзеяння патокаў атамаў, іенаў і выпраменьвання з паверхні цвердага цела. Распрацаваў новыя метады стварэння высакаякасных металічных, паўправадніковых і дыэлектрычных слаёў і мікрасхем на структурах метал-дыаксід крэмнію-крэмній.

Атрымаў Дзяржаўную прэмію Беларусі (1984 г.) за стварэнне навуковых асноў, распрацоўку тэхналогіі і арганізацыю высокарэнтабельнага выканання нізкапарогавых вялікіх інтэгральных схем камплементарных метал-окісел-паўправаднік-структурах.

М. У. Румак - аўтар 200 навуковых прац па мікраэлектроніцы, распрацоўцы тэхналагічных рэжымаў вырабу інтэгральных мікрасхем, тэхналогіі фарміравання кампанентаў і элементаў інтэгральных мікрасхем, 60 вынаходніцтваў. Адзін з аўтараў манаграфій “Зарядовые свойства МОП-структур” (1980), “Диэлектрические плёнки в твердотельной микроэлектронике” (1990).

Матэрыял падрыхтаваны ў 2016 г. Пінскай цэнтральнай раённай бібліятэкай імя Я. Янішчыц. Станкевіч Клаўдзія Аляксандраўна, гал. бібліёграф аддзела абслугоўвання і інфармацыі

1. **Румак, Н. В.** Исследование поверхностного слоя пластически деформированных металлов при прокатке: автореферат диссертации на соискание ученой степени кандидата технических наук (05.324) / Н. В. Румак; Академия наук БССР, Отд-ние физ.-техн. наук. Минск, 1970. 21 с.
2. **Румак, Н. В.** Исследование поверхностного слоя пластически деформированных металлов при прокате: диссертация канд. техн. наук / Н. В. Румак; Академия наук БССР, Физико-технический институт. Минск, 1970. 206 с.
3. **Гурский, Л. И.** Зарядовые свойства МОП-структур / Л. И. Гурский, Н. В. Румак, В. В. Куксо; под ред. А. П. Достанко. Минск: Наука и техника, 1980. 200 с.: граф., табл. Библиогр.: с. 191-199
4. **Румак, Н. В.** Система кремний - двуокись кремния в МОП-структурах / Н. В. Румак; ред. В. М. Колешко; АН БССР, Физ.-техн. институт. Минск: Наука и техника, 1986. 239, [1] с.: ил. Библиогр.: с. 219-236 (302 назв.).
5. **Румак, Н. В.** Диэлектрические пленки в твердотельной микроэлектронике / Н. В. Румак; под ред. В. Е. Борисенко; АН БССР, Физ.-технический институт. – Минск: Навука і тэхніка, 1990. 191 с.: ил. Библиогр.: с. 181-189
6. **Румак, Н. В.** Процессы саморегулирования при создании многослойных структур / Н. В. Румак, В. В. Хотько, С. С. Васильев // Докл. АН БССР. 1990. Т. 34. № 8
7. **Румак, Н. В.** Компоненты МОП-интегральных микросхем / Н. В. Румак; ред. А. П. Достанко; АН БССР, Физ.-технический институт. Минск: Навука і тэхніка, 1991. 311 с.: ил. Библиогр.: с. 298-309 (297 назв.).
8. **Тонкие** неорганические пленки в науке и технике / Ю. Л. Емельянов, Н. В. Румак, С. В. Синицын. Минск: [б. и.], 1991. 48 с.
9. **О назначении** Н. В. Румака председателем Комитета по науке и технологиям министерства образования и науки Республики Беларусь: Пост. Кабинета Министров Республики Беларусь от 26 сентября 1994 г. № 95 // Собрание указов Президента и постановлений Кабинета Министров Республики Беларусь, 1994 г., № 6, ст. 155
10. **Румак Мікалай Уладзіміравіч** // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. Мінск, 2001. Т. 13. С. 440
11. **Румак Николай Владимирович** // Республика Беларусь: энциклопедия: в 6 т. Минск, 2008. Т. 6. С. 528
12. **Румак Николай Владимирович** // Регионы Беларуси: энциклопедия в 7 т. Т. 1. Брестская область: в 2 кн. Минск, 2009. Кн. 2. С. 322-323
13. **Румак Николай Васильевич** // Учёные Пинщины / авт.-сост. И. А. Кибак, П. Н. Синкевич, В. В. Василевицкий. Пинск, 2012. С. 108-109
14. **Член-кореспондент** Румак Николай Владимирович [электронный ресурс] // Режим доступа: http://nasb.gov.by/rus/members/correspondents/rumak.php

Пінскі раён
Хойна
Румак Мікалай Уладзіміравіч
юбілей